Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

10 САКАВІКА 2017 г. ПЯТНІЦА № 46 (28410)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Моцнай паводкі не чакаецца**

СТАР. 3



**Курапаты: агульная памяць і асабістае…**

СТАР. 16



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір ДВОРНІК, старшыня Гомельскага аблвыканкама:**

*«Мясцовым органам улады для вырашэння праблем насельніцтва трэба выкарыстоўваць усе існуючыя рэзервы, каб дапамагчы чалавеку. Нельга даводзіць да таго, каб праблема чалавека стала яго «хваробай». Таксама нельга дапускаць і таго, каб работа са зваротамі грамадзян ператварылася ў фармалізм. Галоўнае: жаданне пайсці насустрач і ўсебакова разабрацца. Тым больш, для вырашэння праблем насельніцтва ў нас ёсць усе рэзервы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9126 | ▲ |
| Еўра | 2,0153 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0711 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ЗАХАВАЦЬ ГАЛОЎНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

**Якім чынам развіццё краіны залежыць ад адказнасці грамадзян**

**На змену глабальным інтэграцыйным працэсам прыходзіць усведамленне пярвічнасці нацыянальных інтарэсаў. Адпаведная тэндэнцыя назіраецца як у вядучых краінах Захаду, так і ў Беларусі. Спачатку павінны быць абаронены такія каштоўнасці, як стабільнасць дзяржавы і спакой грамадства. Гэта — задача нумар адзін. Далей такой краіне, як наша, якая мае адкрытую экспартаарыентаваную эканоміку, трэба ўлічваць бягучыя сусветныя тэндэнцыі і аператыўна на іх рэагаваць. Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр ЛУКАШЭНКА гаварыў учора падчас нарады па актуальных пытаннях развіцця краіны, на якой былі закранутыя і надзённыя тэмы.**

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

# Для крылатых вешчуноў вясны



Дзевяцікласнікі Нараўлянскай сярэдняй школы №2 Антон УЧАЕЎ, Руслан ХЛАПОК, Мікіта НОВІКАЎ, Віялета ДАСЬКО і Максім ГУЧ разам з настаўнікам працоўнага навучання Дзмітрыем РУДЗІНСКІМ развешваюць новыя шпакоўні, зробленыя ў школьнай майстэрні.

Фота БЕЛТА.

# ЖЫЛЛЁ Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ

## У Мінску для чаргавікоў сёлета «квадрат» будзе каштаваць да 1 тысячы рублёў

**Паводле слоў намесніка старшыні Мінскага гарвыканкама Віктара ЛАПЦЕВА, прыярытэтным кірункам работы будаўнічага комплексу сталіцы застаецца будаўніцтва жылля. І гэта зразумела, бо ў галоўным горадзе краіны сёння самая вялікая чарга маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Па стане на пачатак года яна складае 208,5 тысячы сямей і асобных грамадзян.**

### Будаваць будуць менш

Спецыяліст расказаў, што летась у горадзе было пабудавана 777,2 тысячы квадратных метраў пры заданні 735 тысяч. Сёлета эксперты запланавалі ўзвесці тут 664 тысячы «квадратаў», у тым ліку для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, — 160 тысяч кв.м. Прагназуецца, што па лініі дзяржзаказу будзе пабудавана 67 тысяч квадратных метраў, 45 тысяч «квадратаў» — для шматдзетных сем'яў, а таксама ўзведзена каля 7 тысяч квадратных метраў арэнднага жылля. Масавае будаўніцтва буйнапанэльных жылых дамоў запланавана ў раёне вёскі Сухарава, у Лошыцы, Чыжоўцы, раёне вуліцы Алібегава, а таксама на тэрыторыі былых ваенных частак у Масюкоўшчыне, на вуліцах Кабушкіна і Шышкіна.

Цана жылля ў горадзе залежыць ад раёна, інфраструктуры, канструкцыі дамоў і кошту матэрыялаў. «У першым квартале года заключаліся дагаворы з цаной квадратнага метра ад 900 да 1000 рублёў для маючых патрэбу, што адпавядае ўзроўню мінулага года», — адзначыў Віктар Лапцеў.

### Дзяржпадтрымкі на ўсіх не хапае

Сёння ў сталіцы ў жыллёвай чарзе знаходзяцца каля пяці тысяч шматдзетных сем'яў. Больш за тое, каля 500 з іх прастаялі ў гэтай чарзе больш за тры гады. Кіраўніцтва горада адзначае, што цалкам гэту праблему сёлета вырашыць не ўдасца. Аб'ёмаў адпаведнага фінансавання хопіць толькі на тое, каб накіраваць на будаўніцтва з дзяржпадтрымкай прыкладна 300—360 сем'яў. А за гэты час колькасць сем'яў з доўгімі тэрмінамі чакання можа яшчэ павялічыцца...

Паводле слоў Віктара Лапцева, у сувязі са скарачэннем аб'ёмаў ільготнага крэдытавання летась усё часцей выкарыстоўвалася такая форма дзяржаўнай падтрымкі, як узвядзенне жылля з рэнтабельнасцю забудоўшчыка не больш за 5%. Такім чынам у мінулым годзе палепшылі свае жыллёвыя ўмовы ў тым ліку 57 шматдзетных сем'яў. У гэтым выпадку шматдзетныя сем'і атрымліваюць ад дзяржавы субсідыі.

СТАР. 3

# Інтарэсы краіны — на 200 працэнтаў

Учора кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад аб асобных пытаннях дзейнасці Беларускай калійнай кампаніі. На сустрэчу з Прэзідэнтам былі запрошаны генеральны дырэктар Беларускай калійнай кампаніі Алена Кудравец, генеральны дырэктар ААТ «Беларуськалій» Іван Галаваты і старшыня Беларускага дзяржаўнага канцэрна па нафце і хіміі Ігар Ляшэнка.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што прадстаўнікі расійскага боку ўжо не першы раз звяртаюцца да яго з просьбай аднавіць перапыненае некалькі гадоў таму ўзаемадзеянне з «Беларуськаліем» па вытворчасці і продажы ўгнаенняў, паведамляе БЕЛТА.

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы раней даручаў прапрацаваць варыянты сумеснай работы «Беларуськалія» і «Уралкалія». «Але там інтарэсы Беларусі павінны быць захаваны ўжо на 200 працэнтаў, а не на 100 працэнтаў. Мы ўжо наеліся гэтай сумеснай работы, таму калі працаваць разам, то — з тэрыторыі Беларусі, сумленна і прынцыпова дамовіўшыся па ўсіх пытаннях, і ў гэтым ключы дзейнічаць. Мы не пойдзем ні на якія ўступкі, але да кампрамісаў гатовы. Але гэтыя кампрамісы павінны быць узаемавыгаднымі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Усё павінна быць сумленна і аб'ектыўна. Калі мы разам пачнём працаваць, значыць, мы павінны дамовіцца з імі, заключыць дагавор і дзейнічаць. Калі мы бачым, што нашых інтарэсаў там няма, значыць, не трэба на гэта ісці. Будзем працаваць, як працавалі», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

# Насельніцтва — 20 мільёнаў чалавек

## У гэтым мэта дзяржаўнай палітыкі

**У адной зале сабраліся сапраўдныя жанчыны і мужчыны — з вялікай літары. Першыя — адданыя маці, якія не пабаяліся нарадзіць пяцёра і болей дзяцей і цяпер выхоўваюць іх. Другія — абаронцы нашай краіны, якія працуюць для таго, каб маці магла спакойна займацца выхаваннем. Напярэдадні 8 сакавіка Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў ім дзяржаўныя ўзнагароды Рэспублікі Беларусь і генеральскія пагоны афіцэрскаму складу.**

Вольгу Котаву лёгка прыняць за артыстку, настолькі яна танюткая, гожая і ўсмешлівая. Але насамрэч жанчына па прафесіі фельдшар-акушэр, а па прызванні — маці пяці дачок. «Ёсць такая прымаўка, што Бог зрабіў камплімент жанчыне, калі падарыў ёй дачку. Значыць, жанчына вартая свайго паўтарэння. А мяне паўтарылі цэлых пяць разоў», — усміхаецца яна. Аляксандр Лукашэнка з асаблівай цеплынёй звярнуўся да прысутных дам, якія атрымалі ордэн Маці, і не раз падкрэсліў, што для маці пяці і болей дзяцей яны выглядаюць дужа маладымі. «Вы проста малайцы, вы выконваеце галоўную сваю місію. І гэта мэта ўсёй маёй палітыкі — у Беларусі павінна быць не менш за 20 мільёнаў чалавек. Вось тады мы будзем магутныя як ніколі і ніхто ў наш бок коса глядзець не будзе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У адной з зал Палаца Незалежнасці можна было пачуць не толькі цокат абцасаў, але і лёгкі звон нагрудных медалёў, якія цяпер належаць ужо генералам. Генеральскія пагоны ўручаны тым, хто «трымае ў руках шчыт Айчыны». Кіраўнік дзяржавы з пачуццём гонару за беларускую армію нагадаў і аб велізарнай адказнасці, якая ляжыць на плячах кожнага — ад галоўнакамандуючага і міністра абароны да радавога, — за міжнародную сітуацыю і за мір і спакой у краіне. «У нас няшмат генералаў. Але я і не планую павялічваць генеральскі корпус, каб не прынізіць гэта званне. Генерал — гэта асаблівы чалавек», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ЗАХАВАЦЬ ГАЛОЎНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

## Бухгалтэрыя — не найлепшы падмурак інтэграцыі

Змена акцэнтаў з інтэграцыі на нацыянальныя інтарэсы ў эканоміцы заўважная па імкненні краін абараніць унутраныя рынкі, развіваць вытворчасць на сваёй тэрыторыі і, безумоўна, пры ўсім гэтым абмяжоўваць доступ канкурэнтаў на свой рынак. У палітыцы ўвага канцэнтруецца ў першую чаргу на ўласных праблемах, якія ў пераважнай большасці развітых краін набываюць усё большую вастрыню.

— Праглядаюцца як станоўчыя, так і негатыўныя аспекты. У цэлым арыентацыя на прыярытэтнасць нацыянальных інтарэсаў адпавядае і нашым імкненням — гэта факт. Тут мы ідзём у рэчышчы сусветных тэндэнцый, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Аднак негатыўны бок такога працэсу заключаецца ў тым, што цяпер сур'ёзна пагаршаюцца магчымасці выхаду нашай прадукцыі і паслуг на рынкі іншых краін, якія ўводзяць усё новыя бар'еры. Што насцярожвае — нашы сяброўскія, блізкія краіны гэтым таксама не грэбуюць.

Падчас пасяджэння міжурадавага савета Еўразійскага эканамічнага саюза, якое адбылося некалькі дзён таму ў сталіцы Кыргызстана, зноў было закранута пытанне цаны на расійскі газ для нашай краіны. У прыватнасці, прэм'ер-міністр Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Мядзведзеў адзначыў, што калі б Беларусь не ўваходзіла ў склад ЕАЭС, то плаціла б за газ па еўрапейскіх цэнах.

— Гэта падобна на намёк усім і ў Расіі, і ў Беларусі, што мы з'яўляемся нахлебнікамі. Не хачу ўнікаць у дэталі, але Мядзведзеў павінен разумець: калі мы будзем плаціць як у Еўропе, яму таксама прыйдзецца заплаціць. Цана будзе неймаверна вышэйшая, чым цана на прыродны газ. Мне здавалася, і я так думаю дагэтуль, і, відаць, пераважная большасць рускіх людзей разумеюць, што нашыя адносіны з Расіяй — гэта не бухгалтэрыя. Бухгалтэрыя, цана на прыродны газ не павінны ляжаць у аснове нашых адносін. У аснове нашых адносін ляжыць нешта большае, — заявіў учора Прэзідэнт Беларусі датычна выказвання расійскага прэм'ера.

Пазіцыя нашай дзяржавы ранейшая: мы патрабуем, па-першае, каб кіраўніцтва Расіі выконвала свае абавязкі, як слушна адзначыў кіраўнік дзяржавы, «па змесце і па духу». Па-другое, калі мы будуем наш саюз, то ў нашых прадпрыемстваў, бізнесу павінны быць роўныя ўмовы на гэтым рынку.

## Сэнс і «падводныя камяні» Дэкрэта №3

Асобна Прэзідэнт засяродзіў увагу на сацыяльна-эканамічным развіцці краіны. Дэкрэт №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» ўжо не ўпершыню закранаецца на ўзроўні кіраўніка дзяржавы.

— Дэкрэт не з'яўляецца эканамічным і фінансавым, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта ідэалагічны маральны дэкрэт, ніякіх там вялікіх грошай дзяржава не атрымае. Мэтай гэтага дэкрэта з'яўляецца адно — прымусіць працаваць тых, хто павінен і хто можа. Гэта галоўнае.

У той жа час многія пенсіянеры яшчэ могуць працаваць, але гэта — іх жаданне і ўласны выбар. Прынамсі, сваё яны ўжо адпрацавалі. Або людзі з абмежаванымі магчымасцямі, шматдзетныя маці — іх таксама ўладкоўваць на працу ніхто не прымушае. Наадварот, дзяржава іх імкнецца ўсяляк падтрымліваць — за кошт бюджэтных сродкаў. Але ж у бюджэт далёка не ўсе, хто павінен, робяць свае ўнёскі. Частка кошту камунальных паслуг, адукацыя, медыцына — усё гэта пакрываецца дзяржавай, якая таксама мае неабходнасць у падтрымцы.

Прыняцце названага дэкрэта ўзварухнула грамадства. Калі казаць пра пазітыўныя моманты, то рэзка знізілася цякучасць кадраў у арганізацыях і на прадпрыемствах, беспрацоўныя пачалі актыўна звяртацца ў службы занятасці. Такім чынам, людзі зразумелі, што трэба зарэгістравацца і шукаць працу. А гэта і ёсць, як неадназоначна падкрэсліў Прэзідэнт падчас нарады, галоўная мэта дэкрэта.

Але выкрыліся і не вельмі прыгожыя нюансы.

У многім прыняцце дакумента паспрыяла правядзенню своеасаблівага перапісу. Была сфарміраваная рэальная інфармацыйная база — спісы аб занятасці насельніцтва. Але, на жаль, гэта атрымалася не адразу. Спачатку выкананне дэкрэта перакладалі на падатковыя службы, і «лісты шчасця», як іх цяпер называюць, накіравалі амаль 500 тысячам чалавек. І толькі пасля рэзкай рэакцыі Прэзідэнта гэтыя спісы пачалі перапраўляць — у кароткі тэрмін колькасць лістоў скарацілася прыкладна да 300 тысяч.

Кіраўнік дзяржавы зрабіў заўвагу чыноўнікам за безадказнае выкананне дэкрэта.

— Мы не павінны крыўдзіць людзей, асабліва ў гэты час. Тыя, хто сёння па 200, 300, 500 чалавек выходзяць на вуліцы і панічнае крычаць, гэта не тыя людзі, якія сапраўды ўтрыманцы. Гэта ў асноўным людзі, якія пакрыўджаныя, якім мы ні з таго ні з сяго паслалі гэтыя апавяшчэнні, — заначыў Прэзідэнт.

Таму Аляксандр Лукашэнка загадаў яшчэ раз вызначыць спісы тых, хто абавязаны ўносіць адпаведны плацеж. Тэрмін — да першага красавіка бягучага года. Акрамя гэтага, падчас нарады Прэзідэнт прыняў наступныя рашэнні па дэкрэце №3. Па-першае, на працягу 2017 года не спаганяць з так званых сацыяльных утрыманцаў, па якіх будуць створаны спісы ў першым квартале, гэты падатак. Тым, хто аплаціў у 2016 годзе, гэтая сума пойдзе ў залік 2017 года, калі гэты чалавек і ў бягучым годзе працаваць не будзе. Калі ж ён паступіць на працягу гэтага года на працу, то грошы яму вернуцца — па патрабаванні. Такім чынам, выбар за чалавекам.

Па-другое, складзеныя за першы квартал бягучага года ўсе спісы плацельшчыкаў павінны быць прыведзены ў ідэальны парадак — да першага кастрычніка 2017 года. Калі ў некага ёсць прэтэнзіі, мясцовыя ўлады павінны сустрэцца з кожным такім чалавекам і дапамагчы знайсці яму працу.

Па-трэцяе, за 2017 год узносы павінны быць выплачаны да 1 сакавіка 2018 года, але людзям пра гэта трэба сказаць загадзя. Усе грошы, якія будуць атрыманы за кошт гэтага плацяжу, застануцца менавіта ў раённых бюджэтах і цалкам пойдуць на дзяцей.

— Людзі павінны разумець, што яны перш за ўсё павінны шукаць сабе працу, а мы ім павінны дапамагчы. Самае галоўнае, да першага мая ўсе павінны быць працаўладкаваны, — даручыў кіраўнік дзяржавы. — Гэтая задача цалкам рэальная.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз нагадаў пра заданне забяспечыць сярэднюю зарплату па краіне на ўзроўні 500 долараў. Яно абавязковае і патрабуе тэрміновага выканання.

## Правы выказацца

У краіне неабходна стварыць усе ўмовы для цывілізаванага дыялогу ўлады з грамадствам, у тым ліку ў пытанні правядзення масавых мерапрыемстваў, — яшчэ адна задача, якую паставіў на нарадзе Прэзідэнт.

«На плошчу чалавеку нельга забараніць хадзіць. Падключыцеся да гэтай работы, паколькі гэта работа правалена ў Мінску, абласных, буйных гарадах. Вызначыце ў гарадах тую плошчу, на якую людзі могуць прыйсці і выказаць сваё меркаванне. Там будуць начальнікі вертыкалі ўлады», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Але ніякай перашкоды нармальна жыць тым, хто працуе, быць не павінна. Вы ведаеце, што нашы "майданутыя" паехалі ў Кіеў шукаць там "майданутых" арганізатараў. Вы ж разумееце, што гэтыя людзі (якія ўдзельнічаюць у масавых акцыях. — Заўв. аўтара) будуць гарматным мясам, масоўкай. Яны ж не з палітычнымі лозунгамі туды ідуць. А 300—400 чалавек на чале з нашымі адмарозкамі, якія ў Кіеў ездзілі, — яны будуць правакаваць. Яны знойдуць 10—20 прафесіяналаў, якія ў Кіеве адкрылі стральбу. А калі пральецца кроў, тады ўжо бяда. Таму працаваць трэба на папярэджанне. Я гавару гэта публічна», — сказаў Прэзідэнт.

«Мы павінны навучыцца весці дыялог з людзьмі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы не супраць шэсцяў, дэманстрацый. Мы і на дзяржаўным узроўні гэта праводзім (нядаўна да Дня міліцыі правялі). Людзям для выказвання сваіх меркаванняў таксама павінна быць адведзена сваё месца, як у развітых краінах Захаду. Няхай туды прыходзяць і выказваюць уласнае меркаванне», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў забяспечыць жорсткую адказнасць за парушэнні. «Спыняць усялякія спробы (гэта не датычыцца людзей, якія хочуць звярнуць на сябе ўвагу і якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю). Нам трэба, як разынкі з булкі, павыкалупліваць правакатараў. І адказваць яны павінны па ўсёй строгасці закона», — заявіў беларускі лідар, дадаўшы, што «майдана ў Беларусі не будзе. Нават перадумоў да гэтага няма. Але заўсёды трэба працаваць на далёкіх подступах да той ці іншай праблемы».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Парламенцкі дзённік

# Вучыцца будзем па-новаму?

**У пачатку сакавіка завяршылася публічнае абмеркаванне новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі. Вадзім БОГУШ, першы намеснік міністра адукацыі і кіраўнік рабочай групы па падрыхтоўцы Кодэкса аб адукацыі, расказаў, што прапаноў было шмат, але ўсе яны датычыліся дэталяў. Пасля юрыдычнага аналізу яны ўлічацца пры ўзгадненні Кодэкса. Учора ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прайшоў круглы стол на тэму «Асноўныя напрамкі ўдасканалення заканадаўства аб адукацыі», дзе яшчэ раз разгледзелі новую рэдакцыю.**

Гэты круглы стол стане адным з серыі такіх мерапрыемстваў. Плануецца, што пройдуць сустрэчы ў такім фармаце з прадстаўнікамі вышэйшай і сярэдняй адукацыі, а таксама кропкава па актуальных пытаннях. Гэта робіцца для таго, каб яшчэ да ўнясення Кодэкса на разгляд у Палату прадстаўнікоў знайсці самыя спрэчныя моманты. **Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРЗАЛЮК** лічыць, што «усе беды ад сырых, «недапечаных» законаў». Кодэкс аб адукацыі павінен максімальна спрыяць павышэнню якасці падрыхтоўкі і вучня, і студэнта.

— У камісію зараз паступае шмат прапаноў, бывае да 60 ад аднаго чалавека, — расказвае Ігар Марзалюк. — Мы іх будзем перадаваць у рабочую групу міністэрства, самі ставіць на кантроль і разглядаць. Мы па максімуму плануем улічыць рацыянальныя ідэі.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Каментарый у тэму

# Кожны павінен удзельнічаць у суфінансаванні дзяржвыдаткаў

## Пра гэта заявіла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава

«Для таго, каб выконваліся тыя сацыяльныя гарантыі, якія ўзяла на сябе дзяржава, вядома, мы разумеем, што кожны чалавек павінен працаваць і ўдзельнічаць у суфінансаванні гэтых выдаткаў», — адзначыла Наталля Качанава.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта расказала, што адно з пытанняў, якое разглядалася на ўчарашняй нарадзе ў кіраўніка дзяржавы, датычылася рэалізацыі Дэкрэта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства». Была звернута ўвага на дапушчаныя пралікі ў гэтай рабоце. «Перш за ўсё тут не спрацавалі кіраўнікі мясцовых органаў улады, якія павінны былі правесці адпаведную тлумачальную работу з людзьмі», — патлумачыла яна.

Акрамя таго, рэалізацыя дэкрэта лягла на плечы падатковых органаў, што было няправільным. Таму паведамленні аб неабходнасці выплаціць збор на фінансаванне дзяржвыдаткаў часам атрымлівалі людзі, з якіх ён і не павінен быў спаганяцца. Пасля стараннага аналізу сітуацыі ў рэгіёнах было прынята рашэнне, што гэтай работай зоймуцца мясцовыя органы ўлады.

«Задачы пастаўлены няпростыя. Сёння трэба адпрацаваць кожнае паведамленне, якое паступіла. Вылучыць тых людзей, якія павінны плаціць гэты збор. Прычым плаціць яго павінны тыя, хто сапраўды не працуе. Гэты дэкрэт — не фінансавы і не эканамічны дакумент, а сацыяльны. Людзі павінны ўдзельнічаць у фінансаванні дзяржаўных расходаў. І таму стаіць задача перш за ўсё вызначыць тых людзей, якія павінны і могуць працаваць», — адзначыла Наталля Качанава.

Яна дадала, што тыя людзі, якія па аб'ектыўных прычынах працаваць не могуць, і адпаведна не павінны выплачваць збор, ужо вызначаны дэкрэтам. Аднак плануецца пашырыць гэты пералік катэгорый грамадзян. Пры гэтым выплата збору на год прыпыняецца. «2017 год толькі пачынаецца, і людзі маюць магчымасць самі вызначыць, будуць яны працаваць і не плаціць гэты збор ці не працаваць і ўдзельнічаць у фінансаванні дзяржаўных расходаў, — падкрэсліла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Тым людзям, якія ўжо заплацілі збор, калі яны працаўладкаваныя і будуць працаваць, падатковыя органы будуць абавязаныя вярнуць гэтую суму.

Усе грошы, якія будуць паступаць у бюджэты раёнаў і гарадоў пры рэалізацыі норм Дэкрэта №3, будуць накіроўвацца на падтрымку дзяцей у розных сферах.

Наталля Качанава звярнула ўвагу, што кіраўнікі гарадоў і раёнаў падтрымліваюць дадзены прававы акт. «Яны кажуць, што нарэшце ўбачылі рэальную карціну, чым займаюцца людзі. Ёсць шэраг грамадзян, якія проста ніколі не працавалі і працаваць не хочуць, тыя, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. І такіх нямала», — сказала яна.

Разам з тым аналіз рэалізацыі дэкрэта паказаў, што ёсць рэгіёны, дзе маюцца праблемы з працаўладкаваннем. Таму пастаўлена задача максімальна аказваць дапамогу людзям пры пошуку працы.

**БЕЛТА**

# ЖЫЛЛЁ Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ

### Самафінансаванне камерцыйнага жылля

Спікер адзначыў, што цяпер вырашаны сістэмныя пытанні па будаўніцтве арэнднага жылля. «Мы вызначыліся з падыходамі, адпрацавалі рашэнні па фінансаванні, вызначылі канкрэтныя аб'екты. Узводзіць арэнднае жыллё ў Мінску будзем за кошт сродкаў, якія паступаюць ад здачы ў наём жылля», — расказвае Віктар Лапцеў. Спецыялістамі падлічана, што гэтыя сродкі дазваляюць штогод будаваць у горадзе па два арэндныя дамы. Ён растлумачыў, што ў папярэднія гады арэнднае жыллё ўзводзілася за кошт прамога фінансавання з бюджэту. Напрыклад, летась былі здадзены ў эксплуатацыю два арэндныя дамы (па вуліцы Солтыса ў Партызанскім раёне і ў квартале «Магістр»), закладзена аснова для будаўніцтва жылля ў 2017 годзе. У першую чаргу арэндныя кватэры прадастаўляюцца грамадзянам, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, звычайна — у парадку чаргі.

### Гарады-спадарожнікі застаюцца на стадыі планавання?

Адначасова з генеральным планам сталіцы былі зацверджаны і генеральныя планы гарадоў-спадарожнікаў. Далей патрэбна распрацоўка праектаў дэталёвай планіроўкі і адначасова ўдасканаленне па пытаннях інфраструктуры. «Аднак хутка пачаць будаўніцтва жылля не атрымаецца», — лічыць намеснік старшыні.

Сёння ўсе згаджаюцца, што тэма развіцця гарадоў-спадарожнікаў ва ўмовах скарачэння жыллёвага будаўніцтва ў межах МКАД становіцца ўсё больш актуальнай. Паводле генплана, колькасць жыхароў сталіцы не павінна перавышаць два мільёны чалавек. Жыллё прапануецца будаваць у першую чаргу ў Рудзенску і Смалявічах, а таксама ў Заслаўі, Фаніпалі, Дзяржынску і Лагойску. Але пакуль развіццё гарадоў-спадарожнікаў Мінска знаходзіцца на этапе горадабудаўнічага планавання.

Паводле слоў Віктара Лапцева, сёння ахвотных змяніць мінскую прапіску не так і шмат, таму неабходна стварыць дадатковыя стымулы для пераезду, а таксама арганізоўваць узнікненне перспектыўных працоўных месцаў, займацца размяшчэннем вытворчасцяў. Цяпер карэктуецца пастанова, якая датычыцца пераносу прадпрыемстваў з Мінска за МКАД. Толькі пасля гэтага з'явіцца больш канкрэтыкі па гарадах-спадарожніках. Цяпер вядзецца будаўніцтва жылля і інфраструктуры ў Смалявічах, спецыялісты прыглядаюцца да тэрыторыі Рудзенска, робіцца папярэдняя распрацоўкі.

Намеснік старшыні лічыць, што развіццё гарадоў-спадарожнікаў — зона адказнасці не толькі Мінгарвыканкама, але і Мінаблвыканкама, таму гэтыя пытанні трэба вырашаць у комплексе.

### Дзіцячыя садкі, паліклінікі і іншае...

Згодна з інвестыцыйнай праграмай у 2016 годзе ў Мінску пабудаваны 4 дзіцячыя садкі, два з іх у Каменнай Горцы, па адным у Міхалове і Масюкоўшчыне. Уведзены ў эксплуатацыю дзіцячая паліклініка ў Каменнай Горцы, парк экстрэмальных відаў спорту на вуліцы Сталетава, рэканструяваны стадыён «Арбіта». Паводле слоў намесніка старшыні Мінгарвыканкама, летась удалося павысіць тэмпы будаўніцтва мінскага метрапалітэна. Гэтага змаглі дасягнуць за кошт павелічэння да дзвюх тысяч і больш колькасці рабочых на аб'екце і набыцця сучаснага механізаванага комплексу.

**Сёння ў сталіцы ў жыллёвай чарзе знаходзіцца каля пяці тысяч шматдзетных сем'яў. Каля 500 з іх прастаялі ў гэтай чарзе больш за тры гады.**

Сёлета плануецца да ўводу такі знакавы аб'ект, як стадыён «Дынама». Будуецца Цэнтр мастацкай гімнастыкі па праспекце Пераможцаў, які дазволіць весці падрыхтоўку нашых спартсменаў на самым высокім узроўні.

А вось знос будынкаў на інвестыцыйнай пляцоўцы (у раёне былой 2-й гарадской бальніцы) у Мінску плануецца завяршыць у лістападзе-снежні. Для выставачнага павільёна «Белэкспа» падбіраецца іншая пляцоўка. Праўда, Віктар Лапцеў кажа, што пакуль застаецца пытанне з новым участкам для павільёна. «Пытанне ў фінансаванні, раней разглядалася пляцоўка ў раёне вуліц Кіжаватава — Карланеўскага. Ёсць праектная дакументацыя па гэтым аб'екце, разглядаецца магчымасць прыцягнення інвестараў. Тэма актыўна абмяркоўваецца», — удакладніў спецыяліст.

Нагадаем, што інвестыцыйны дагавор на забудову тэрыторыі былой 2-й гарадской бальніцы заключаны ў канцы 2016 года, праект павінен завяршыцца да 2021 года. Інвестар — кампанія з ААЭ. На гэтым месцы будзе пабудаваны гандлёва-забаўляльны цэнтр з гасцініцай, сучаснай аўтастаянкай, падземным паркінгам.

### Тайм-аўт ад Газпрама

Будаўніцтва «Газпрам Цэнтра» на месцы аўтавакзала «Маскоўскі» сёння законсервавана, але ёсць намер працягнуць рэалізацыю праекта, кажуць у мэрыі. «Магчыма, справа ва ўзаемаадносінах забудоўшчыка з падрадчыкамі. Пакуль казаць пра тое, што праект ажыццяўляцца не будзе, падстаў ніякіх няма. У заказчыка і інвестара ёсць жаданне дабудаваць аб'ект, таксама, як і ў горада», — адзначыў Віктар Лапцеў. Раней паведамлялася, што ўзвядзенне шматфункцыянальнага комплексу «Газпрам Цэнтр» пачалося ў 2015 годзе, завяршыць аб'ект планавалася ў 2018-м. Спецыяліст паведаміў, што горад сёлета плануе рэалізацыю і іншых праблемных інвестыцыйных праектаў. У прыватнасці, у найбліжэйшы час будзе завершана будаўніцтва гасцініцы каля Белдзяржцыркa, плануюць аднавіць работу па праектах бізнес-цэнтра «Футурыс» на праспекце Незалежнасці і шматфункцыянальнага комплексу «Гулівер».

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Я зноў выбіраю «Звязду»

### Заўсёды ў трэндзе

**Дырэктар Беларускага тэатра «Лялька» (Віцебск) Аляксандр ГРЫГОР'ЕЎ:**



«Звязда» — адзіная рэспубліканская дзяржаўная газета, якая друкуецца на беларускай мове, не здраджвае гэтай добрай традыцыі. І апошняе вельмі добра.

Наш тэатр і рэдакцыю звязвае шматгадовае вельмі плённае супрацоўніцтва. Калі задумацца, чытачы газеты «Звязда» — адначасова і нашы гледачы. Прыемна, што іх колькасць з кожным годам не змяншаецца.

Асабіста мне як прадстаўніку творчага калектыву ў першую чаргу цікава прачытаць публікацыі, прысвечаныя галіне культуры. І ў газеце нават ёсць спецыялізаваная ўкладка. Заўсёды прыемна, калі там з'яўляюцца публікацыі пра людзей, якіх ведаю. Вельмі цікавіць эксклюзіў: тое, што пакуль не надрукавалі іншыя перыядычныя выданні. На мой погляд, заўсёды запатрабаваныя журналісцкія матэрыялы, прысвечаныя вывучэнню «сігналаў» ад чытачоў. Бо прыватныя скаргі, якія вывучаюць рэпарцёры, часта актуальныя для многіх людзей.

У слаўны год 100-гадовага юбілею газеты ад імя маіх калег жадаю «Звяздзе», як заўсёды, адпавядаць патрабаванням часу. Таксама — новых творчых знаходак, больш тыражу, дзесяцігоддзяў росквіту.

**Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## Вам адкажуць

**По традыцыі ў суботу званкі жыхароў краіны будуць прымаць кіраўнікі гарадоў, раёнаў і абласцей, разам яны паспрабуюць знайсці шляхі выхаду з праблемных сітуацый.**

**Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 у суботу, 11 сакавіка, правядуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні Сакоўскі Віктар Яўгенавіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў Цярэнцьеў Уладзімір Уладзіміравіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні Канюшка Андрэй Васілевіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні Бубенчык Алена Аляксандраўна (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні Чыкіда Алег Іванавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні Плаўскі Алег Альфрэдавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні Лапцеў Віктар Сяргеевіч (80172224444).

## Фінансы

### Стаўку рэфінансавання зніжаюць

**Яна змяняецца ў нас ужо трэці раз з пачатку года**

**З 15 сакавіка зніжаецца стаўка рэфінансавання з 16% да 15% гадавых, а таксама стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях па падтрымцы бягучай ліквіднасці банкаў — з 20% да 18% гадавых. З гэтага дня памяншаецца і памер ставак па пастаянна даступных аперацыях выключэння ліквіднасці — з 11% да 10% гадавых.**

У прэс-службе Нацбанка паведамляюць, што чарговае ў гэтым годзе зніжэнне працэнтных ставак звязана з запавольненнем інфляцыі, а таксама станоўчымі тэндэнцыямі на валютным і дэпазітным рынках. Эксперты рэгулятара адзначаюць, што інфляцыя працягвае зніжацца, і яе запавольненне адбываецца больш значнымі тэмпамі, чым чакалася раней. Прырост спажывецкіх цэн, па абноўленай ацэнцы, у лютым—красавіку не перавысіць 8 працэнтаў у гадавым выражэнні.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

## Надвор'е

# ДОЖДЖ ЯШЧЭ СЯБРУЕ З МОКРЫМ СНЕГАМ

**Аднак у першую дэкаду сакавіка фон сярэднясутачных тэмператур быў на 7—10 градусаў вышэй за кліматычную норму**

**Першыя дні парадавалі нас цяплом. Амаль паўсюдна па тэрыторыі Беларусі сышло снежнае покрыва, толькі па паўночным захадзе Віцебскай вобласці яго вышыня на раніцу 9 сакавіка складала 1—4 см. Будзе цёпла і сонечна і надалей. Але на выхадныя ў краіне чакаюцца ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, паведамілі намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

У выхадныя большая частка краіны будзе знаходзіцца ў вільготнай паветранай масе. У суботу дождж і мокры снег чакаюцца ў асноўным па паўднёва-ўсходніх і паўночна-заходніх раёнах краіны. Магчымы слабы туман, у начныя і ранішнія гадзіны ў паўночна-заходніх раёнах — галалёд, на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. У нядзелю ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу чакаюцца ў многіх раёнах Беларусі. Уначы і раніцай у паўночна-заходніх раёнах магчымы слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ў суботу і нядзелю будзе вагацца ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла, а ўдзень прагназуецца ад плюс 1 да плюс 8 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня пад уплывам вобласці павышанага ціску ўмовы надвор'я пачнуць паляпшацца, ападкаў прагназуецца менш, толькі ў паўднёвай частцы краіны яшчэ захаваецца ўплыў атмасферных франтоў. Чакаецца, што ў панядзелак мокры снег і дождж будуць турбаваць нас толькі ў кароткачасовым фармаце пераважна па паўднёвай частцы Беларусі. У асобных раёнах магчымы туман і слабы галалёд. Месцамі ўначы будзе падмарожваць. Мінімальная тэмпература паветра ў панядзелак уначы складзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла, удзень будзе ад плюс 2 да плюс 8. У аўторак чакаецца ўвогуле сонечнае надвор'е. Будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым усходзе краіны прагназуюцца невялікія кароткачасовыя ападкі (мокры снег і дождж). У асобных раёнах туман, слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла, а ўдзень будзе 2—9 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# МОЦНАЙ ПАВОДКІ СІНОПТЫКІ НЕ ЧАКАЮЦЬ

— Паводка сёлета будзе крыху вышэйшая за тую, якая адзначалася летась, — расказала **начальнік Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Марыя ГЕРМЯНЧУК.** — Але калі ўлічыць, што ў 2015 і 2016 гадах яе актыўнасць была даволі нізкая, то ніякай катастрофы мы не чакаем.

— Цікава, што талая вада пакуль што фарміруе максімальныя ўзроўні ў басейнах Сожа, Заходняй Дзвіны і Дняпра, — кажа Марыя Гермянчук. — А вось Заходні Буг, Бярэзіна і Прыпяць напаўняюцца ўжо дзякуючы ападкам. У гэтых рэках узроўні вады таксама павысяцца — дажджы будуць ісці амаль паўсюдна і на гэтым тыдні, і на наступным.

— Па нашых разліках, падтапленні магчымыя ў 16 раёнах краіны ў 51 населеным пункце, 4 садовых таварыствах, пабудаваных у поймах рэк, на 17 участках дарог і 11 мастах, — зазначыў **начальнік Рэспубліканскага цэнтра кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС Андрэй ЮРЖЫЦ.** — Ужо цяпер затоплены тры ўчасткі дарог — на Гомельшчыне і Віцебшчыне, — але сітуацыя там некрытычная. Мы арганізавалі пераправу на лодках. І аўтакрамы туды могуць па неабходнасці дастаўляць прадукты.

Калі ж населены пункт будзе адрэзаны вадой, мы туды падвязём прадукты харчавання. У нас ёсць тры судны на паветраных падушках, сфарміраваны 14 атрадаў. У іх маецца тэхніка, якая можа адпампаваць ваду і хутка дабрацца да месца здарэння. На баявых пастах вахту нясуць 2344 чалавекі і 1500 адзінак выратавальнай тэхнікі, тысяча да таго ж знаходзіцца ў рэзерве. Мы задзейнічаем і касмічны маніторынг: пры неабходнасці картаграфічны аналіз падтопленай тэрыторыі будзе рабіцца з калязямной прасторы. Паколькі вытокі асноўных праблемных рэк знаходзяцца ва Украіне і Расіі, то мы наладзілі кантакты са службамі МНС гэтых краін па абмене інфармацыяй.

Спецыялісты маніторацъ стан не толькі рэк, але і азёр, сажалак і вадасховішчаў. На гэтых вадаёмах лёд сыходзіць не так хутка з-за малога цячэння ці ўвогуле з-за яго адсутнасці. Там дагэтуль яшчэ захоўваецца лёд, аднак трываласць яго зараз ужо нулявая. Таму падарожжы па паверхні вадаёмаў і зімовую рыбалку давядзецца адкласці да наступнай зімы.

— Між іншым, 8 сакавіка на Чыжоўскім вадасховішчы ў сталіцы пад лёд праваліліся трое рыбакоў, — паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Аляксандр ПАПКО.** — Драма разыгралася за сорак метраў ад берага. Да моманту прыбыцця падраздзяленняў двух небарак выцягнулі відавочцы, трэцяга выратавалі нашы байцы. Два з іх шпіталізаваны з дыягназам «пераахаладжэнне».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

■ Век вучыся

# З БЕСПРАЦОЎНАГА — У КІРОЎЦЫ ТРАМВАЯ

## Службы занятасці пашыраюць пералік прафесій для перападрыхтоўкі

**Сёлета спектр адукацыйных паслуг для мінчан папоўніўся новымі прафесіямі. Сярод іх — арматуршчык, электрамеханік па ліфтах, цесляр-бетоншчык, страхар, кіроўца трамвая і іншыя. Жыхары сталіцы, што звяртаюцца ў службу занятасці, з гэтага года могуць таксама прайсці навучальныя курсы па рэкламнай графіцы.**



Фота Надзеі БУЖАН.

— Новыя спецыяльнасці з'яўляюцца на падставе прагнозу рынка працы і яго патрэб у кадрах рабочых і спецыялістаў адпаведнай кваліфікацыі. Улічваюцца таксама прафесійныя запыты беспрацоўных і іх адукацыя, — тлумачыць **начальнік аддзела арганізацыі навучання грамадзян упраўлення занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Вольга ТАРАСЮК.**

Усяго сталічная служба занятасці арганізуе падрыхтоўку па 33 прафесіях і спецыяльнасцях. Тэрмін навучання — да года. Так, за месяц можна атрымаць прафесію кладаўшчыка, за два — адміністратара, за тры — аператара кацельнай ці рабочага па комплексным абслугоўванні і рамонце будынкаў.

Летась у сталіцы на навучанне быў залічаны 1441 беспрацоўны. 65 працэнтаў з іх — мужчыны. У асноўным на курсы запісваюцца мінчане, старэйшыя за 30 гадоў. Сярод тых, хто праходзіў навучанне, грамадзян ва ўзросце 16—29 гадоў — 420 чалавек, з якіх 20 — непаўналетнія. Пераважная частка (67,5 працэнта) асвойваюць рабочыя прафесіі.

— Найбольшай папулярнасцю карыстаецца адукацыя па спецыяльнасцях адміністратара, кухара, слесара па рамонце аўтамабіляў, манціроўшчыка шын і шына-пнеўматычных муфтаў, сакратара, інспектара аддзела кадраў, цырульніка, электрагазазваршчыка, — расказала Вольга Тарасюк.

Гарадская служба занятасці практыкуе таксама такую форму дзейнасці, як навучанне па заказе наймальніка. Летась на курсы на такіх умовах было залічана 123 чалавекі. 96 мінчан асвоілі прафесію кіроўцы тралейбуса, 19 — машыніста электрацягніка. Рыхтавалі таксама кухараў, праграмістаў, цырульніка, ліфцёра, электрагазазваршчыка і кіроўцу пагрузчыка. Сёлета па заказах наймальнікаў плануецца таксама навучанне кіроўцаў трамвая, дзяжурных на атракцыёнах і гульнявым абсталяванні, кантралёраў-касіраў, прадаўцоў.

У цэлым па краіне летась на прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі службы занятасці накіравалі каля 11 тысяч беспрацоўных. Больш за ўсё накіраванняў выдадзена на Гомельшчыне (амаль дзве тысячы). А ў Магілёўскай вобласці палова тых, хто быў залічаны на курсы, навучаліся непасрэдна па заказе наймальнікаў. У Брэсцкай і Гомельскай абласцях такую гарантыю далейшага працаўладкавання меў кожны трэці «курсант», а ў сярэднім па краіне — амаль кожны чацвёрты.

У тройцы самых папулярных прафесій для перападрыхтоўкі беспрацоўных апынуліся аператар кацельнай, індывідуальны прадпрымальнік і прадавец.

Летась у Беларусі накіраванне на прафадукацыю атрымалі 5,2 працэнта беспрацоўных. Дзяржаўнай праграмай аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва на 2016—2020 гады прадугледжана, што гэты паказчык павінен быць як мінімум 4,4 працэнта.

На перападрыхтоўку беспрацоўных выдаткоўваецца фінансаванне з дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Гэтыя сродкі прызначаныя для арганізацыі навучання розных катэгорый асоб: вызваленых работнікаў, тых, хто шукае працу ўпершыню, нядбайных бацькоў, якія абавязаны кампенсаваць дзяржаўныя расходы на ўтрыманне дзяцей у інтэрнатах, і іншых. У прыярытэтным парадку на курсы накіроўваюцца беспрацоўныя, што маюць асаблівую патрэбу ў сацыяльнай абароне і не здольныя на роўных правах канкурыраваць на біржы. Новая рэдакцыя закона аб занятасці дазволіла таксама праходзіць прафадукацыю жанчынам, якія даглядаюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў. Гэта пашырае для маладых маці магчымасці атрымаць прафесію і працоўнае месца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Дэмаграфія

# Сталічных немаўлят павіншаваў міністр юстыцыі

**33 двойні і 3 тройні зарэгістравалі летась у Цэнтральным раёне Мінска, а за два месяцы 2017-га тут з'явілася ўжо 11 двойняў, так што можна смела казаць пра павышэнне нараджальнасці, спрагназаваў Алег СЛІЖЭЎСКІ, міністр юстыцыі Беларусі, які асабіста ўручыў пасведчанне аб нараджэнні тром немаўлятам.**

Акцыя «Слава жанчыне, якая дае жыццё» прайшла ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры «Маці і дзіця». Свой першы дзяржаўны дакумент і фотаальбом атрымалі Мікіта Кульбіцкі, Міхаіл Закрэўскі і Ева Крот.

**Летась у Беларусі нарадзілася амаль 119 тысяч немаўлят. Найбольш дзяцей зарэгістравана ў Мінску — больш за 26,7 тысячы, Брэсцкай вобласці — больш за 18,4 тысячы і Гомельскай вобласці — 18, 1 тысячы. Самыя папулярныя ў 2016-м імёны хлопчыкаў: Аляксандр, Арцём, Дзмітрый, Іван, Максім, дзяўчатак — Настасся, Ганна, Дар'я, Марыя і Сафія.**

Падобнае мерапрыемства орган юстыцыі арганізаваў упершыню, а кіраўнік міністэрства паабяцаў, што ўрачыстае віншаванне немаўлят і іх мам — адно з цэлага шэрагу свят, якія прыдумалі супрацоўнікі Мінюста, каб сёлета ў снежні адзначыць 100-годдзе з дня ўтварэння органаў ЗАГС Беларусі.

— Нараджэнне дзіцяці — гэта заўжды хвалюючая падзея і шчаслівы момант у сям'і для мам, татаў, іх блізкіх. Гэта таксама важна і для дзяржавы, бо кожнае немаўля — гэта новы маленькі грамадзянін, які, падросшы, будзе тварыць нашу далейшую гісторыю, будзе рабіць наша жыццё лепшым, — выказаўся Алег Сліжэўскі. — Хачу пажадаць вашым дзецям расці здаровымі, шчаслівымі і разумнымі. І каб іх жыццёвы шлях быў даўжынёю не менш за век.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5 | | |
| **Продавец** | Смолевичское районное потребительское общество, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133 | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Лот №1** | | | |
| **Здание магазина** | 82,3 кв. м | 614/С-18990 | Минская обл., Смолевичский р-н, Усяжский с/с, д. Избицкое |
| **Составные части и принадлежности** | сарай | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0410 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 15 253 руб. 20 коп.** | | | |
| **Лот №2** | | | |
| **Магазин** | 89,9 кв.м | 614/С-34398 | Минская обл., Смолевичский р-н, Драчковский с/с, д. Синие Горы, ул. Центральная |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1071 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания магазина | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 26 751 руб. 33 коп.** | | | |
| **Лот №3** | | | |
| **Здание магазина** | 95 кв. м | 614/С-18983 | Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, д. Сосновая, ул. Центральная, д. 52Б |
| **Составные части и принадлежности** | пристройка, сарай, отмостка, два крыльца | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0600 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 04.10.2114) для обслуживания магазина №42 | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 98 158 руб. 20 коп.** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010, в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г.Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда»: по лотам №1 и №2 от 24.12.2016, по лоту №3 – от 20.10.2016 | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **12.04.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5, ЗАО «Центр промышленной оценки».** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **10.04.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5, ЗАО «Центр промышленной оценки».** | | |
| **Контактные данные** | **+375-17-280-36-37, +375-29-317-95-42, Email: auction@cpo.by, www.cpo.by.** | | |

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения, земельный участок, на котором расположен объект** | - незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. №451/U-14874 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – магазин), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Дятлово, ул. Новогрудская, 25. Расположено на земельном участке, кадастровый номер 422350100001001102, (назначение – строительство и обслуживание магазина, инженерных коммуникаций, автомобильной стоянки и подъездной дороги к нему), площадью 0,5701, расположенном по адресу: г. Дятлово, ул. Новогрудская, 25. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании): земельный участок, расположенный в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильной дороги, код 7,1, площадью 0,0721 га; земельный участок, расположенный в охранных зонах линий связи и радиофикации, код 13,1, площадью 0,0062 га.<br>- сооружение, инв. №411/С-15592 (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства 3 06 02, наименование – автодром), площадью 3655,0 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Восточная, 19. Расположено на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001132, (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения 1 16 00 (для обслуживания сооружений автодрома)), площадью 0,3655, расположенном по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Восточная, 19. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании): земли, расположенные в водоохранных зонах водных объектов, код 4.1, площадью 0,3655 га.<br>- сооружение, инв. №411/С-15580 (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства 3 06 02, наименование – автомобильная стоянка), площадью 2132,0 кв. м, расположенное по адресу: г.п. Большая Берестовица, ул. Анохина, 24, автомобильная стоянка, периметр 192,9 м. Расположено на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001131, (назначение – земельный участок для размещения объектов автомобильного транспорта (автостоянок и гаражей)), площадью 0,2712, расположенном по адресу: г.п. Большая Берестовица, ул. Анохина, 24. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании): земли, расположенные в водоохранных зонах водных объектов |
| **Начальная цена продажи** | 348 725,76 р. (триста сорок восемь тысяч семьсот двадцать пять рублей семьдесят шесть копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 17 436 р. (семнадцать тысяч четыреста тридцать шесть рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | Гродненское областное потребительское общество, 230023, г. Гродно, ул. 1 Мая, 28, тел. 72-30-50, факс 72-00-67 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 24 марта 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 20 марта 2017 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
*http://grodnoino.by/*

■ Прадметная размова

## Гурт «NAVIBAND»:

# «МЫ — ТАЛІСМАНЫ АДНО ДЛЯ АДНАГО»




**Беларускія артысты падорацьфанатам «Еўрабачання» стужкі з нацыянальнай сімволікай**

**Да старту «Еўрабачання-2017» у Кіеве засталося менш як два месяцы, а гурт «Naviband», які сёлета прадстаўляе Беларусь, здаецца, зусім не напружваецца на гэты конт. 8 сакавіка артысты выступілі ў Гродне, хутка адбудуцца канцэрты ў Баранавічах, Гомелі і Наваполацку, далей запланаваны паездка ў Маскву на спектакль Яўгена Грышкаўца, з якім гурт плённа супрацоўнічае, і выступленне ў Мінску... Таму ледзь не з парога я прычапілася да салістаў гурта Ксеніі Жук і Арцёма Лук'яненкі з пытаннем: няўжо так упэўнены ў сваіх сілах, каб сумяшчаць падрыхтоўку да міжнароднага конкурсу з канцэртным турам?**

— Ну, а як інакш? — здаецца, крыху здзіўляецца Арцём. — Канешне, мы ўсведамляем, што «Еўрабачанне» — вельмі важны крок у жыцці, і адказна да яго рыхтуемся. Але ж мы музыканты, мы гурт, каманда, таму павінны трымаць сябе ў форме!

— Мы запісалі новы альбом, і натуральна, мусім прадставіць яго слухачам у розных гарадах, — дадае Ксенія. — Тым больш, гэта не дадатковая нагрузка, хутчэй наадварот — мы адпачываем на гэтых канцэртах, пераключаемся з напружанай працы на стасункі з любімымі слухачамі. Так што адно аднаму не замінае, і чатыры канцэрты на месяц — далёка не насычаны гастрольны тур.

***— Тады раскажыце, на якім этапе падрыхтоўка да «Еўрабачання» і хто ўваходзіць у вашу каманду?***

**Арцём**: Цяпер мы шліфуем песню, займаемся з педагогам па вакале, выступаем у суседніх краінах — былі ва Украіне, на чарзе яшчэ Латвія, магчыма, Літва, а таксама выступленне ў Ізраілі і ў Амстэрдаме (там традыцыйна праходзіць афіцыйная вечарынка ўсіх удзельнікаў). Ужо сфарміравалася каманда, у якой кожны чалавек адказвае за пэўны аспект конкурснай падрыхтоўкі і, што немалаважна, з якімі побач нам камфортна працаваць. Гэта наш піяр-менеджар Сяргей Андрыянаў, які прапанаваў заспяваць па-беларуску песню Джамалы (*«1948» — кампазіцыя, з якой украінская спявачка выйграла леташняе «Еўрабачанне». —* **Аўт.**). Канешне, Вольга Шлягер і Вольга Саламаха, якія адказваюць за беларускую дэлегацыю на конкурсе і кантралююць усе арганізацыйныя моманты. Стыліст-дызайнер Сяргей Вярынскі, які працуе над нашымі вобразамі і над прамапрадукцыяй, — і менавіта ён прыдумляе канцэртныя ўборы для сцэны «Еўрабачання». Над графікай працуе мастак Марына Назарава. Вельмі дапамагае выкладчык па вакале Вольга Драздова, у якой вялікі вопыт працы менавіта для «Еўрабачання» — ды ўсю каманду пайменна, напэўна, мы проста зараз не прыгадаем. На конкурснай сцэне нас будзе падтрымліваць бэк-вакал, а ў зале — бацькі і сябры, якія спецыяльна прыедуць у Кіеў.

***— У апошнія дні зімы ў гурта прайшла афіцыйная фотасесія да конкурсу. Акрамя нацыянальных строяў, асаблівы сэнс фотасесіі надала старажытная кніга — рарытэтная Біблія Францыска Скарыны з архіваў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі...***

**Арцём**: Канешне, трэба было адштурхнуцца ад значнага гістарычнага факта, каб падкрэсліць гісторыю і веліч беларускай культуры. Таму, калі абмяркоўвалі ідэю фотасесіі, вырашылі не проста апрануцца ў беларускія кашулі, але і ўзяць у рукі скарынаўскую Біблію. Ідэя супала з 500-годдзем беларускага кнігадрукавання — лічу, гэта зоркі сышліся выдатным чынам. Некаторыя прыхільнікі цікавіліся, чаму ў нас з Ксюшай уборы не па памеры, занадта вялікія. Тут зноў жа ўсё не проста так. Мы не любім біць у лоб відавочным пасылам, а хочам абудзіць у людзей іх уласныя згадкі. Вялікія кашулі — сімвалы нацыянальнай культуры, а мы — толькі малыя яе часцінкі. Вельмі прыемна, што многія фанаты «Еўрабачання» называюць нас пасламі беларускай культуры на конкурсе — хоць гэта, безумоўна, не толькі вялікі гонар, але і вялікая адказнасць.

**Ксенія**: Таму ў фотасесіі няма нічога штучнага і наўмысна прыдуманага, мы насамрэч вельмі любім і шануем свае карані і заўжды стараемся іх трымацца.

***— Вы чатырнаццатыя па ліку беларускія дэлегаты на «Еўрабачанні», але першыя, хто прадставіць на ім песню на роднай мове. Пасля перамогі ў нацыянальным адборы вы запэўнівалі, што не дабавіце ў тэкст ні слоўца на англійскай...***

**Арцём**: Так, у тэксце нічога не змянілася. Па-першае, у беларускіх удзельнікаў ужо былі папярэдне 13 спроб спяваць на англійскай — паспяховымі можна назваць хіба некалькі з іх. А па-другое, я лічу, беларускамоўная песня — гэта прарыў для нашай культуры і для сённяшняга пакалення, якому важна, каб беларуская мова прагучала на ўсю Еўропу. Тым больш, сёлетні слоган «Еўрабачання» — «Святкуй разнабаковасць» — як мага лепей дае ўдзельнікам магчымасць прадставіць нацыянальную разнастайнасць.

***— Нягледзячы на тое, што ваша перамога ў нацыянальным адборы выглядала самай «бяскроўнай» за апошнія некалькі гадоў, усё адно гучала пэўная крытыка — у прыватнасці, да празмернай эмацыянальнасці Ксюшы. Да заўваг вы прыслухоўваецеся?***

**Арцём**: У большай ступені прыслухоўваемся да крытыкі тых людзей, з якімі ідзём побач у творчасці. А меркаванне тых, каго мы не ведаем, можа быць прадузятым проста таму, што людзі нас не зразумелі... Усіх не наслухаешся, усім не дагодзіш. Наша пазіцыя — рабіць перадусім так, як адчуваем мы самі.

**Ксенія**: Да кожнай песні, да кожнага выступлення мы падыходзім з душой, шчыра і адкрыта, каб людзі бачылі, што мы такія, як ёсць насамрэч, не ўпадабняемся да кагосьці, не надзяваем маскі. У падрыхтоўцы да «Еўрабачання» мы таксама прытрымліваемся гэтага прынцыпу.

***— Часы прома-пакетаў «па-багатаму», напэўна, ужо мінулі, крызіс усіх прымусіў эканоміць, але сувенірная прадукцыя ўсё ж важнасці не страціла. Ці вядома ўжо, што павязе ў Кіеў «Naviband»?***

**Арцём**: Гэта абавязкова будзе стужка з нашым лагатыпам, які ўтрымлівае элементы беларускага арнаменту — сімвалы Зямлі і Сонца. Падобныя стужкі мы дарылі, калі былі на нацыянальным адборы ва Украіне, і ўбачылі, што людзям яны даспадобы. Гэта якраз не пафасна, не пошла, але ад душы і падкрэслівае нашу лінію. Безумоўна, прома-папка будзе ўключаць інфармацыю пра нас, англамоўны тэкст песні, фота, аўдыя- і відэаматэрыялы. Астатняе пакуль вырашаецца.

***— Я, можна сказаць, прадстаўнік мэтавай аўдыторыі «Еўрабачання»: хатняя гаспадыня, якая ў маі абавязкова ўключыць тэлевізар, каб паглядзець відовішчнае шоу. Чым вы «зачэпіце» мяне за 3 хвіліны песні, каб вымусіць узяцца за тэлефон і галасаваць?***

**Арцём**: Ксюшынымі ямачкамі на шчоках... Не? Тады прастатой і непадробнасцю. Як мы адчуваем, цяпер вельмі важна паказаць тое, чаго не было да цябе, сказаць, хто ты ёсць. Мы — беларусы, і я лічу, што еўрапейцам будзе цікава пачуць, як гучаць наша музыка і мова.

**Ксенія**: А яшчэ, канешне, рэфрэнам «Хэй-хэй»! Гэта тое, я спадзяюся, што запомніцца і будзе спявацца на кожнай мове.

***— Папярэднія беларускія ўдзельнікі падказвалі вам, да чаго рыхтавацца і чаго чакаць непасрэдна на конкурсе?***

**Арцём**: Так, некаторыя парады нам даў Юра Вашчук, Юзары падзяліўся сваім досведам. Цяпер мы разумеем, чаму яны казалі: «Еўрабачанне» — нялёгкая праца, і, мабыць, не кожнаму артысту варта ў яе ўвязвацца».

**Ксенія**: Не, я жадаю кожнаму паспрабаваць свае сілы, але трэба быць моцным, асабліва псіхалагічна.

**Арцём**: Цудоўна, што мы з Ксюшай удваіх ідзём па гэтым шляху, у нас ёсць падтрымка адно аднаго, што б ні здарылася.

**Ксенія**: Мы нават больш, чым падтрымка, мы — талісманы адно для аднаго. Бо калі адзін у чымсьці сумняваецца, не ўпэўнены ва ўласных сілах, то другі зможа даць яму патрэбны штуршок, гэткі чароўны выспятак, якога часам вельмі не хапае, каб рухацца далей.

***— Летась чарговы раз змяніліся правілы галасавання на «Еўрабачанні», і цяпер інтрыга вакол пераможцы трымаецца да апошніх імгненняў. На ваш погляд, якая сістэма больш справядлівая? Перавагу мусяць мець гледачы або прафесійнае журы?***

**Арцём**: Мне здаецца, хоць шоу робіцца дзеля гледачоў, але ўсё ж меркаванне прафесійнага журы вельмі важнае, і яго нельга ігнараваць, бо музычныя эксперты заўважаюць рэчы, на якія простая публіка і ўвагі не звяртае. А непрадказальны вынік, які часам прыносіць сума ацэнак журы і гледачоў, — гэта выдатна, гэта інтрыга, а значыць, гэта цікава яшчэ большай колькасці людзей.

**Ксенія**: 50/50 — мяркую, самая ўдалая формула галасавання. У творчасці ўсе ацэнкі наогул суб'ектыўныя, і толькі сума розных, нават палярных, меркаванняў дае аптымальны вынік.

***— Для шэрагу беларускіх артыстаў конкурс з розных прычын, на жаль, стаў не адпраўной кропкай, а хутчэй, парталам у творчы нябыт. Вы не баіцеся «праклёну Еўрабачання»?***

**Арцём**: Думаю, у нас ужо склалася свая публіка, якая нас «падпітвае» на кожным канцэрце, падтрымлівае і будзе падтрымліваць. Канешне, прадугледзець усе сцэнарыі развіцця падзей немагчыма, але ў нас настрой вельмі пераможны, мы скіраваныя найлепшым чынам прадставіць сваю краіну.

**Ксенія**: Калі думаць аб тым, хто што скажа пасля «Еўрабачання» — нічога не атрымаецца. Таму я не люблю загадваць і смяшыць Бога будаваннем далёкіх планаў. Трэба адказваць за бягучы момант і рабіць усё, каб захаваць упэўненасць у сабе, не згубіць той драйв і шчырасць, якую ўпадабалі слухачы і журы ў нацыянальным адборы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

***Больш поўную версію чытайце на сайце «Звязды» www.zviazda.by.***

**Сёння букмекеры, якія часта ўгадваюць пераможцаў шоу, бачаць у ліку фаварытаў Італію, Швецыю і Расію (нягледзячы на тое, што апошняя дагэтуль не назвала свайго прадстаўніка і наогул абмяркоўвае магчымы байкот шоу). Прадказаць, ці трапіць у спіс лідараў сёлета Беларусь, пакуль што проста немагчыма. Але «Naviband» такія непадробна шчырыя і сапраўдныя, поўныя, нібы бярозавік, жыццёвай энергіі і правільна «зараджаныя» светлымі эмоцыямі, што вельмі хочацца пажадаць ім — і нам усім — удачы. Сачыце за ямачкамі на шчочках!**


## СА «ЗВЯЗДОЙ» — УСЁ Ў ПАРАДКУ

**Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на II квартал або I паўгоддзе 2017 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 7 красавіка 2017 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.**
**Сярод падпісчыкаў 12 красавіка 2017 года будуць разыграны 7 прасаў Tefal і суперпрыз — пыласос Bosch. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 22 красавіка 2017 года.**
**Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30 чэрвеня 2017 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або I паўгоддзе 2017 года і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Са «Звяздой» — усё ў парадку!» чытайце ў нумары 43 газеты «Звязда» ад 3 сакавіка 2017 года.**
**Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.**
**Тэрмін правядзення гульні — з 04.03.2017 па 30.06.2017 года.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2944 ад 01.03.2017 года, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Пылесос Bosch



Прас Tefal



**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал і I паўгоддзе 2017 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________________________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ______________________
(аддзяленне сувязі)
на II квартал і I паўгоддзе 2017 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [          ] (індэкс) __________

______________________________________________

______________________________________________

Удачы ў розыгрышы!

## Аўторак, 14 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».*****
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Практыка».***
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».*****
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Закаханыя жанчыны».*****
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.35** Дзень спорту.
**0.45 Серыял «Жыць спачатку».*****

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.35** Тэлебарометр.
**9.05, 18.35 Серыял «Апошні з Магікян».*****
**10.15, 17.10 Дэтэктыў «Такая работа».*****
**11.05, 16.15 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».***
**12.00** Два рублі.
**12.20, 19.40** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.05,21.20, 22.05** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05** Горад.
**18.00** «Пра ежу».
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Лестэр» (Англія) — «Севілья» (Іспанія).
**0.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ. Агляд.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Зуцы (катлеты з грыбоў).
**8.00, 12.00, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Ясенін». Драма.*****
**9.15, 13.15 «Вой, ма-мач-кі!» Меладрама.***
**11.00** «Гітара па крузе».
**12.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**12.15** «Наперад у мінулае».
**12.40** М/ф.0
**12.50, 23.55** «Дыя@блог». Пра вечнае.
**15.05** «Подых струн».
**15.45, 21.05** «Бамбардзіроўшчыкі і штурмавікі Другой сусветнай». Дак. фільм. 1-я серыя.*
**16.25, 21.40 «Вяртанне Будулая». Драма. 1-я серыя.***
**17.45, 23.00 «Сеткавая пагроза». Дэтэктыў. 1-я серыя.*****
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Выйсце ёсць». Дзмітрый Астрахан.
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**8.40** Час футбола.
**9.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Другі паўфінал. Другі матч. «Нёман» (Гродна) — ХК «Гомель».
**11.15** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. 1/2 фіналу. Трэці матч. «Барыс» (Астана) — «Металург» (Магнітагорск).
**13.10—18.20** Тэніс. Турнір WTA. Індыян — Уэлс.
**18.20** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**18.50** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Першы паўфінал. Трэці матч. «Шахцёр» (Салігорск) — «Юнацтва-Мінск». (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
**21.10** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/16 фіналу. Матчы ў адказ. Агляд.
**22.05** Спот-кадр.
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Ювентус» (Італія) — «Порту» (Партугалія). (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.20** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».*****
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Мурка».*****
**23.00 Маст. фільм «Тры цалі».**
**0.45** «Вячэрні Ургант».
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Мінშчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.45, 0.20 «Знахар. Паляванне без правілаў». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Маст. фільм «Федра».***
**15.55 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**1.55 Маст. фільм «Цыган». 3—4-я серыі.***

### МІР

**6.00, 1.15** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00 Серыял «Спадчына».*****
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20 Серыял «Закон і парадак».*****
**22.10 Маст. фільм «Дачка».*****
**0.00 Серыял «Спрут».*****
**2.00** — Прафілактыка на тэлеканале.

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.10** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Вераніка. Уцякачка».**
**19.15, 20.40 Серыял «Кранутая».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Кругаварот».**
**0.15** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Таямнічая Расія».***
**7.10, 8.05 Серыял «Адвакат».*****
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».*****
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Пчаляр».*****
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Курортная паліцыя».*****
**17.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».*****
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Ляснік. Свая зямля».*****
**21.25 Серыял «Паляванне на д'ябла».*****
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Дэманы».*****

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Драма «Салдат Джэйн».**



**13.00, 19.30 Серыял «Каралеўства».**
**14.25 Камедыя «Жара».**
**15.55, 19.25, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**17.15 Серыял «Каўчэг».**
**18.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Камедыя «Мытня дае дабро».**
**22.10 Серыял «Амерыканская гісторыя жахаў».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Ёка».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 16.50** Серыял «Вароніны».
**9.40** Камедыя «Атэль для сабак».
**12.00, 5.00** Серыял «Сакратар».
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00, 19.20** Серыял «Мамачкі».
**15.10, 0.40** Серыял «Маладзёжка».
**16.20** Серыял «Сям'я 3D».
**18.00** «Уральскія пельмені».
**20.20** Серыял «Закрытая школа».
**21.30** Баявік «Каламбіяна».
**23.40** Серыял «Месяц».
**1.40** Скетч-шоу «6 кадраў».
**2.00** «Не можа быць!»
**3.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**4.00** Серыял «Амазонкі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Рок, рок, рок!» Маст. фільм.
**12.45** «Захавальнікі Меліхава». Дак. фільм.
**13.10, 20.05** «Правілы жыцця».
**13.40** «Людзі і дэльфіны». Серыял. Фільм першы.
**14.45** «Палех». Дак. фільм.
**15.10** «Крым. Загадкі цывілізацыі». Дак. серыял. Фільм першы.
**15.40** «Саці. Нясумная класіка...»
**16.20** «Больш, чым каханне». Сяргей Вавілаў і Вольга Багрыноўская.
**17.05** Андрыс Нэльсанс і Бостанскі сімфанічны аркестр. Гала-канцэрт у Бостане, 2014.
**17.55** Сусветныя скарбы».
**18.15** «Яўген Святланаў. Успамін...»
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.30** Штучны адбор.
**21.10** «Гульня ў бісер». «В. Распуцін. «Развітанне з Мацёрай».
**21.55** Да 80-годдзя з дня нараджэння Валянціна Распуціна. «Рака жыцця». Дак. фільм.
**23.20** «Антуан Ларан Лавуазье». Дак. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Загадкавы Парыж. «Тайна «Мулен Руж». Маст. фільм.***
**1.20** «Леў Гумілёў. Пераадоленне хаосу». Дак. фільм.
**1.50** «Фідзій». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Прагграма А». 1990 год.***
**7.35** «Творчы вечар Аркадзя Арканава». 1990 год.*
**8.40** Фільм-канцэрт «Адліга». Юрый Шаўчук і гурт «ДДТ». 1988 год.***
**9.35, 13.45, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 1.10, 2.45, 5.25** Музычная настальгія.*
**9.50** Маст. фільм «Бумбараш».***
**12.00** «The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.***
**13.00** Тэлеспектакль «Кошка на радыятары».***
**14.15** «Рок-урок». Шмат музыкі. 1993 год.*
**15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».*
**17.15** Праграма «Стыль». 1992 год.***
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Вобраз ворага». 2007 год.*
**19.10** Тэлеспектакль «Ну, публіка!»***
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1973. 2-я частка. 2010 год.***
**1.15** Маст. фільм «Дрэнны добры чалавек».***
**3.00** «Быў час». 2009 год.***
**4.00** Маст. фільм «Небяспечны ўзрост».***

### EuroSport 1

**3.15** Watts.
**3.30, 7.00** Снукер. The Players Championship. Фінал.
**4.30, 0.00** Футбол. «ФІФА».
**5.00, 6.30, 0.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**8.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**9.30, 21.30, 1.00** Веласпорт. Цірэна — Адрыятыка.
**10.30, 15.00, 20.45, 2.00** Снаўборд. Чэмпіянат свету.
**13.15, 18.30, 22.30, 2.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**1.45** Аўта- і мотаспорт. Тэст-драйв.

### Кінакамедыя

**0.45** Камедыя «Вялікая Афрадыта».***
**2.25** Меладрама «Дапамажыце стаць бацькам».***
**4.10** Камедыя «М + Ж».***
**5.35** Камедыя «9 месяцаў строгага рэжыму».***
**7.05** Камедыя «Кекс у вялікім горадзе».***
**8.40** Камедыя «Жаніх».*
**10.20** Камедыя «Супермозг».***
**12.15** Камедыя «Няхай жыве Францыя!»***
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)» (Выпуск 15).***
**16.00** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... зноў».***
**18.00** Камедыя «Джунглі».***
**19.30** Камедыя «Навіны з планеты Марс».***



**21.20** Камедыя «Нешта падобнае на шчасце».***
**23.00** Камедыя «Піпец».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.35, 14.55** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.00** «Доктар І...»
**8.30, 19.10, 3.05** «20 хвілін». Серыял.
**10.05, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.50** «Сляпая».
**12.50** «Варажбітка».
**13.55** «Паралельны свет».
**15.25** «Здзелка».
**16.00** «Натуральны адбор».
**17.05, 21.50** «Рэвізора».
**18.10** «Тайны следства». Серыял.
**20.50, 2.15** «Ведзьмакі свету».
**23.15** «Гісторыі збаўлення».
**23.45** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.30** «Карты, грошы, два ствалы». Трылер.****




### ТБ1000

**6.10, 17.50** Помні (Мемента).****
**8.30** Цяжкасці перакладу.***
**10.40** Монстр.****
**12.55** Госця.*
**15.25** Прыстанак праклятых.***
**20.10** Уладар пярсцёнкаў: брацтва пярсцёнка.*
**23.30** Непакораны.***
**2.00** Пасейдон.*
**3.50** Джэры Магуаер.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Каўчэг.*
**8.05** Іван, сын Аміра.***
**10.50** Барцу не баліць.***
**12.25** Крымінальны квартэт.*
**14.10** Мечаносец.***
**16.25** Ч/Б.***
**18.20** Афінскія вечары.***
**20.20** Дыгеры.***
**22.20** Свята пад замком.***
**0.10** З Дона выдачы няма.***
**2.10** Асабісты нумар.*
**4.30** На мора!***

### National Geographic

**6.00, 13.15, 20.15, 0.45, 3.55** Гульні розуму.*
**6.40, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.50, 10.55, 14.45** Мегазаводы.*
**8.35, 15.35** Міжнародны аэрапорт Дубай.***
**9.25, 17.55** Антарктыка.*
**10.10, 22.30** Эвакуацыя Зямлі.***
**11.45, 16.20, 19.25, 23.15, 2.15** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.30, 18.40, 21.45, 1.30, 4.50** Космас: прастора і час.*

### Discovery

**8.00, 14.00** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітва за нерухомасць.*
**11.00** Таргі без тармазоў.*
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.*
**19.00** Браты Дызель.***
**20.00** Хуткія і гучныя.***
**0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.***



**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.***
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***




# БЯЖЫЦЬ ВЫЖАЛ ПА РАЗОРЫ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Багу́н —** балотны зараснік з рэзкім пахам.

**Бага́ткі —** дзьмухавец, малачай.

**Ві́льчык —** верхні стык двух бакоў страхі. Яшчэ можна сказаць: *канёк.*

**Вы́жал —** гончы сабака.

**Разо́ра —** канаўка на паверхні зямлі, праведзеная плугам.

**Ражо́н —** прамая тонкая палка з завостраным канцом. Яшчэ можна сказаць, што ражон — завостраны кій, на якім смажаць мяса, сала над агнём.

**Падставіць плячо —** падтрымаць каго-небудзь, аказаць дапамогу. Беларусы яшчэ скажуць: *падаць руку, цягнуць за вушы.* Рускія: *взять на буксир.*

**Уцерці нос —** даказаць каму-небудзь сваю перавагу ў чым-небудзь. Беларускія адпаведнікі: *заткнуць за пояс, наставіць нос.* Рускі: *дать фору.*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

■ Тэлесеткі

# Адкрываем дачны сезон

**Ужо ў гэту суботу на канале «Беларусь 1» пачнецца чацвёрты сезон праекта «Дача». Яго нязменная вядучая, журналіст тэлекампаніі «Магілёў» Таццяна Ларына запэўнівае, што кожны выпуск па-ранейшаму будзе карысным і цікавым для гаспадароў прысядзібных участкаў. «Асаблівы акцэнт сёлета мы зробім на рэкамендацыях навукоўцаў і вопытных селекцыянераў», — адзначаюць аўтары праекта.**



Найбольш актыўныя гледачы змогуць заявіць аб сабе ў эфіры — узяўшы ўдзел у конкурсе прыпевак, пад якія ў іх найбольш спорна ідзе праца на градах. Ахвотных запрашаюць дасылаць «дачныя» прыпеўкі ўласнага сачынення на адрас: ТРК «Магілёў», вул. Першамайская, д. 83, 212030, Магілёў, з паметкай «Праграма «Дача» або на электронны адрас dacha@tvrmogilev.by. Пераможцам дастанецца патрэбныя ў гаспадарцы прылады: трымер, электракультыватар і апырсквальнік.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*

■

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Пачатак тыдня будзе напружаным. Ваша пазіцыя хоць і досыць устойлівая, але ўвесь час падвяргаецца праверцы. Магчымыя правакацыі, вам неабходна распазнаць іх і зрабіць адпаведныя высновы. На працы можа ўзнікнуць канфліктная сітуацыя. Захоўвайце спакой і стрыманасць і паглыбіцеся ў работу. І ўсё вырашыцца само сабой. Надыходзіць час для новых планаў і задум. Пара перагледзець вашы магчымасці і павысіць свой прафесійны ўзровень. Сачыце, каб ваш аптымізм не перайшоў у эйфарыю.



**СКАРПІЁН.** Вы будзеце сур'ёзна захоплены работай. І яна адкажа вам узаемнасцю і высокімі даходамі. Зоркі раяць часова адысці ад сталых стэрэатыпаў і даць магчымасць з'явіцца новаму ў вашым жыцці. Вы можаце планаваць якія-небудзь справы наперад, але не занадта захапляйцеся гэтым, бо магчымыя неабдуманыя расходы. Паспрабуйце захаваць частку энергіі на выхадныя — будзе на што яе выдаткаваць.



**СТРАЛЕЦ.** З'явіцца магчымасць пачаць справу, якая пасля доўгіх намаганняў можа прывесці вас да поспеху. Гэта можа адбыцца дзякуючы навучанню, новай рабоце або праз зносіны з паспяховымі знаёмымі. У пачатку тыдня захоўвайце ў тайне вашы планы і задумы, у адваротным выпадку вашу ідэю могуць паспяхова прысвоіць сабе канкурэнты. У чацвер не варта змагацца з недахопамі шэфа. Лепш мець з ім добрыя адносіны. У асабістых адносінах паспрабуйце трохі стрымліваць свае страсці, каб эмоцыі не пайшлі цераз край. Сакрэт поспеху крыецца ў гарманічным стане і спакойных плаўных дзеяннях.



**КАЗЯРОГ.** Тыдзень абяцае быць дастаткова марудлівым і размераным. Амаль усе задуманыя планы будуць выкананы. Усе ранейшыя канфлікты будуць, нарэшце, шчасна ўладжаныя. Не ўпускайце залатых час, паспрабуйце выкарыстоўваць яго для свайго духоўнага і прафесійнага развіцця максімальна поўна. Вашы дзелавыя сустрэчы ўвянчаюцца поспехам, думайце не толькі пра сённяшні дзень, але і пра найбліжэйшую будучыню. У канцы тыдня могуць узнікнуць новыя і яркія пачуцці. Добры час для рамантычных знаёмстваў і пабудовы новых адносін.



**ВАДАЛЕЙ.** На гэтым тыдні любая праца будзе па сілах, яна, хутчэй за ўсё, апынецца творчай і прынясе доўгачаканую радасць. Але не варта спяшацца, прытрымлівайцеся чакальнай стратэгіі. Вы здольныя дамагчыся ашаламляльных вынікаў, проста апынуўшыся ў патрэбны час у патрэбным месцы. Чакайце добрых навін, знаёмстваў і сустрэч. Аднак у аўторак вечарам не выключаны сваркі з блізкімі людзьмі на фінансавай глебе. У выхадныя ваша абстаноўка гарманізуецца, і вы зможаце спакойна адпачыць усе разам.



**РЫБЫ.** Усе непрыемнасці, якія зусім нядаўна азмрочвалі ваш настрой, адыдуць, нарэшце, на другі план, а затым і зусім знікнуць. Аднак старайцеся ацэньваць усе падзеі, што адбываюцца крытычна, каб не патрапіць у няёмкае становішча. Апынуцца ў далікатнай сітуацыі значна лягчэй, чым з яе выбрацца. У чацвер змена становішча ўзбадзёрыць вас і зменіць настрой у лепшы бок. У пятніцу, вельмі верагодна, адбудзецца падзея, якая адкрые перад вамі новыя магчымасці. Паспрабуйце не спыніцца на дасягнутым, а рухацца наперад.

## Чацвер, 16 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона Х.
**9.10, 22.15 Серыял «След».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Практыка».***
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».***
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Закаханыя жанчыны». Заключная серыя.***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.10** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Буйным планам.
**0.45** Дзень спорту.
**1.00 Серыял «Жыць спачатку».***

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.50** Тэлебарометр.
**9.05, 18.50 Серыял «Апошні з Магікян».***
**10.15, 17.25 Дэтэктыў «Такая работа».***
**11.10, 16.35 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».***
**12.05, 19.55** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.05,21.20, 22.05** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.25** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 22.55** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам.
**18.15** «Пра ежу».
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Хададзец.
**8.00, 12.00, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Ясенін». Драма.***
**9.10, 14.00 «Вой, ма-мач-кі!» Меладрама.***
**10.55** М/ф.0
**11.05** «Гітара па крузе».
**12.15** «Наперад у мінулае».
**12.40** «Эпоха». Адам Міцкевіч.
**13.35, 23.45** «Дыя@блог». Пра літаратуру.
**15.50, 21.05** «Бамбардзіроўшчыкі і штурмавікі Другой сусветнай». Дак. фільм.*
**16.50, 21.40 «Вяртанне Будулая». Драма.***
**17.45, 22.50 «Сеткавая пагроза». Дэтэктыў.***
**19.30** «Музеі Беларусі». Музей гісторыі горада Брэста.
**19.55** «Тэатр у дэталях». Спектакль Тэатра-студыі кінаакцёра «Безыменная зорка».
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00** Слэм-данк.
**8.25** «Жанчыны і спорт». Кацярына Карстэн.
**8.55** Футбол. Кубак Беларусі. 1/4 фіналу. Першы матч. ФК «Мінск» — БАТЭ (Барысаў).
**10.40** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. 1/2 фіналу. Чацвёрты матч.
**12.35** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Першы паўфінал. Чацвёрты матч. «Шахцёр» (Салігорск) — «Юнацтва-Мінск».
**14.30** На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**15.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Манака» (Францыя) — «Манчэстэр Сіці» (Англія).
**16.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Атлетыка» (Мадрыд, Іспанія) — «Баер» (Германія).
**18.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ. Агляд.
**19.20** Авертайм.
**19.50** Гандбол. SEHA-Газпрам ліга. «Заграб» (Харватыя) — БГК імя Мяшкова (Беларусь). (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)
**21.25, 23.00** Футбол. Ліга Еўропы. 1/8 фіналу. Матч у адказ. (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.20** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».***
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Мурка».***
**23.25 Маст. фільм «Канікулы мары».***
**1.05** «Вячэрні Ургант».
**1.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.45, 0.20 «Знахар. Палянаванне без правілаў». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.40 «Следакі». Серыял.**
**16.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».

### МІР

**6.00** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00 Серыял «Спадчына».***
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».***
**19.20, 4.20 Серыял «Закон і парадак».***
**22.10 Маст. фільм «Ад турмы і ад торбы».***
**23.55 Серыял «Спрут».***
**1.05 Маст. фільм «Мэта жыцця».***

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.10** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Веранікa. Уцякачка».**
**19.15, 20.40 Серыял «Кранутая».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Круговарот».**
**0.15** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Таямнічая Расія».***
**7.10, 8.05 Серыял «Адвакат».***
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».***
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Пчаляр».***
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Курортная паліцыя».***
**17.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».***
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Ляснік. Свая зямля».***
**21.25 Серыял «Паляванне на д'ябла».***
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Дэманы».***

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Меладрама «Галава ў аблоках».**
**13.00, 19.30 Серыял «Каралеўства».**
**14.25 Меладрама «Сонечныя канікулы».**
**15.55, 19.25, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Каўчэг».**
**18.20 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**19.15** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Трылер «Доктар Ноў».**
**23.10 Серыял «Амерыканская гісторыя жахаў».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Ёка».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 16.50** Серыял «Вароніны».
**9.40** Камедыя «Модная штучка».
**12.00, 5.00** Серыял «Сакратар».
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00, 19.20** Серыял «Мамачкі».
**15.00, 0.50** Серыял «Маладзёжка».
**16.20** Серыял «Сям'я 3D».
**18.00** «Уральскія пельмені».
**20.20** Серыял «Закрытая школа».
**21.30** Баявік «Сахара».
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**2.00** «Не можа быць!»
**3.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**4.00** Серыял «Амазонкі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Другі хор». Маст. фільм.
**12.45** «Расія, любоў мая!» «Сібірскія самаходы».
**13.15, 20.05** «Правілы жыцця».
**13.40** «Людзі і дэльфіны». Серыял.
**14.40** Сусветныя скарбы.
**15.10** «Крым. Загадкі цывілізацый». Дак. серыял.
**15.40** «Абсалютны слых».
**16.20** Дакументальная камера. «Рабер Брэсон і Андрэй Таркоўскі. Дыялог з дапамогай малюнкаў».
**17.05** Сэр Саймон Рэтл і Берлінскі філарманічны аркестр. Фестываль у Люцэрне, 2013.
**18.15** «Страсці па Шчадрыну».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.30** «Чырвонае і Белае. Эрмлер і Шульгін». Дак. фільм.
**21.25** «Перад судом гісторыі». Дак. фільм.
**23.00** «Справа №. Адрачэнне Мікалая II: апошні дакумент Імперыі».
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Загадкавы Парыж. «Тайна «Гранд-опера». Маст. фільм.***
**1.20** «Леў Карсавін. Метафізіка кахання». Дак. фільм.
**1.50** «Кацусіка Хакусай». Дак. фільм.

### Насталыгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Вобраз ворага». 2007 год.*
**7.10** Тэлеспектакль «Ну, публіка!»***
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».*
**9.40, 11.00, 14.35, 15.40, 17.00, 17.35, 19.20, 21.40, 1.45, 3.40, 5.00** Музычная насталыгія.*
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».*
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год.***
**13.00** Фільм-спектакль «Прачніся і спявай!»*
**17.20** «Час пік» з Андрэем Разбашам. 1995 год.*
**18.00** «Яловая субмарына». 2005 год.***
**18.50** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.***
**19.35** Маст. фільм «Аповесць пра маладых».***
**23.00** «Песня-80» (1-е аддзяленне).*
**0.00** «The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.***
**1.00** Тэлеспектакль «Кошка на радыятары».***
**2.15** «Рок-урок». Шмат музыкі. 1993 год.*
**5.15** Праграма «Стыль». 1992 год.***

### EuroSport 1

**1.20, 4.15, 6.00, 9.30, 12.45, 14.30, 21.45, 0.30** Горныя лыжы. Кубак свету.
**3.15** Watts.
**3.30, 8.30, 11.15, 13.45, 16.00, 17.45, 23.15, 2.05** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**7.00, 10.30, 16.30** Снаўборд. Чэмпіянат свету.
**8.00, 12.15, 17.15, 20.45** Лыжнае двааборʼе. Кубак свету.

### Кінакамедыя

**0.50** Камедыя «Джунглі».***
**2.20** Камедыя «Дзядуля лёгкіх паводзін».****
**4.05, 14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**5.10** Камедыя «Вялікая Афрадыта».***
**6.55** Камедыя «Няхай жыве Францыя!»***
**8.35** Камедыя «Супермозг».***
**10.35** Камедыя «Навіны з планеты Марс».***
**12.20** Камедыя «Нешта падобнае на шчасце».***
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**16.00** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... Бацька нявесты».***
**17.45** Камедыя «Жаніх».*
**19.30** Фантастыка «Ультраамерыканцы».****
**21.15** Меладрама «Нявеста з таго свету».***
**23.00** Камедыя «Факап, або Горш не бывае».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.45, 15.05** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.10** «Доктар І...»
**8.40, 19.10, 2.35** «20 хвілін». Серыял.
**10.15, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.00** «Сляпая».
**13.00** «Варажбітка».
**14.05** «Паралельны свет».
**15.35** «Здзелка».
**16.10** «Натуральны адбор».
**17.05, 21.55** «Рэвізора».
**18.10** «Тайны следства». Серыял.
**20.55** «У майго дзіцяці шостае пачуццё».
**23.05, 5.30** «Вокладка».
**23.35** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.20** «Чалавек са сталі». Баявік.*

### ТБ1000

**6.10, 18.00** Як займацца любоўю па-англійску.****
**8.20** Вераніка вырашае памерці.***
**10.35** Дзяўчына з вады.***
**12.55** Стрынгер.****
**15.20** Дварэцкі.***
**20.10** Па-за часам.***
**22.15** Шэф Адам Джонс.****
**0.15** Тры метры над узроўнем неба: я цябе хачу.***
**2.35** Монстр.****
**4.25** Цяжкасці перакладу.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Бубен, барабан.***
**8.20** Прагулка.*
**10.15** «Перакладчык». 1-я серыя.*
**12.15** Пастка для адзінокага мужчыны.***
**14.05** Гараскоп на ўдачу.*
**16.05** Стылягі.***
**18.35** Раскоп.*
**20.20** Выратаванне.***
**22.10** Масква, я люблю цябе!***
**0.15** «Перакладчык». 2-я серыя.*
**2.10** Іван, сын Аміра.***
**4.45** Каўчэг.*

### National Geographic

**6.00, 13.15, 5.05** Гульні розуму.*
**6.45, 20.05, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.55, 11.00, 14.45** Мегазаводы.*
**8.40, 15.30** Міжнародны аэрапорт Дубай.***
**9.30, 17.50** Золата Юкана.*
**10.15, 22.20** Эвакуацыя Зямлі.***
**11.45, 16.20, 19.20, 20.50, 23.05, 2.05** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.30, 18.35, 21.35, 1.25, 4.25** Космас: прастора і час.*

### Discovery

**8.00, 14.00** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітва за нерухомасць.*
**11.00** Як устроены Сусвет.*
**13.00** Плутон: першая сустрэча.*
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.*
**18.00** Забытая інжынерыя.***
**19.00** Залатая ліхаманка.***
**20.00** Вялікая нафта Іракa.*
**0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.***
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.***
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск №13

Вядомы сайт па шахматнай кампазіцыі «SuperProblem» правёў 181-ы тэматычны турнір па складанні задач-мініяцюр. Беларускі майстар Міхаіл Храмцэвіч сярод 30 складальнікаў стаў чэмпіёнам — 44 балы з 45 магчымых. Вось адна з яго задач *(гл. дыяграму).*



**Белыя:** Kpg3, Фg7, Cd1, пп. e2, g2 (5).

**Чорныя:** Kph5, Лa1 (2).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

Віктар Волчак стаў віцэ-чэмпіёнам, Мікалай Бельчыкаў падзяліў 4-5-е месцы. У камандным заліку Беларусь — першая са 115 баламі, далей ідуць: Расія — 94, Украіна — 78, Сербія — 55, Германія — 54 і яшчэ 8 краін.

* * *

Мінулы раз мы змясцілі партыі пераможцаў першынства Беларусі сярод шахматыстаў да 18 гадоў. А вось як гуляў у гэтым турніры сярэбраны прызёр.

Станіслаў Арцёмаў — Максім Іваннікаў. 1.e4 c5 2. Kc3 g6 3. g3 Cg7 4.Cg2 Kc6 5.Kge2 e6 6.d3 Kge7 7.Ce3 Kd4 8.0-0 0-0 9.f4 d6 10.Лb1 Kec6 11.a3 Cd7 12.b4 b6 13.b5 Ke7 14.e5 de 15.fe Kef5 16.C:d4 cd 17.C:a8 Ke3 18.Фc1 Ф:a8 19.Лf2 C:e5 20.Kd1 Kg4 21.Лf1 Фd5 22.h3 Kf6 23.Фg5 h6 24.Ф:h6 Cc8 25.Kpf2 Cb7 26.Kpe1 Kh5 27.Kf2 K:g3 28.Kg4 K:f1 29.Kf4 Фh1 30.K:e5 Ke3+ 31.Kpf2 Фh2+ 32.Kpe1 Фg1+ 33.Kpe2 Ф:b1, 0:1.

* * *

На жаночым чэмпіянаце свету ў Тэгеране тытул заваявала 25-гадовая кітаянка Тань Чжун'і, якая ў фінале перайграла ўкраінку Ганну Музычук. Дарэчы, яе малодшая сястра Марыя Музычук была чэмпіёнкай свету у 2015—2016 гадах, але зрабіць «залаты дубль» у сясцёр не атрымалася.

У Мінску адбыўся традыцыйны Мемарыял Д. Бранштэйна па хуткіх шахматах. Нагадаем, што Давід Бранштэйн (1924—2006) быў адным з наймацнейшых савецкіх гросмайстраў, у 1951 годзе згуляў унічыю матч на першынство свету з Міхаілам Батвіннікам — 12:12 (згодна з рэгламентам паядынку, Батвіннік пры гэтым захаваў свой тытул). Двухразовы чэмпіён СССР (1948 і 1949), шасціразовы чэмпіён Масквы, пераможца міжзанальных і многіх міжнародных турніраў, аўтар выдатных кніг па шахматах, апошнія гады жыцця Бранштэйн правёў у сталіцы Беларусі, тут жа і пахаваны. У турніры яго памяці сёлета змагаліся 122 шахматысты. Прызавую тройку ў выніку склалі гросмайстры Сяргей Жыгалка, Уладзіслаў Кавалёў і Аляксей Аляксандраў.

У французскім Рашфоры Кірыл Ступак фінішаваў першым з 71 удзельніка, а Мікіта Маёраў — трэцім. Андрэй Гаравец заняў другое месца на турніры ў ЗША, а Вольга Бадэлька — на мужчынскім турніры ў латвійскай Юрмале. У Маскве на фестывалі «Аэрафлот» Уладзіслаў Кавалёў быў трэцім у галоўным турніры «А» (98 удзельнікаў), а Валерый Казакоўскі паказаў такі ж вынік у турніры «Б». У Мінску ў турніры па хуткіх шахматах (этап «Кубка Алешкі», 50 удзельнікаў) прызёрамі сталі Аляксей Аляксандраў, Раман Грыб і Сяргей Уласевіч. У Віцебску прайшоў абласны шахматна-шашачны фестываль да 50-годдзя клуба «Ладдзя», які складаўся з шэрагу турніраў, таварыскіх матчаў і сеансаў адначасовай гульні.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.c4.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

## Пятніца, 17 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».*****
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Практыка».***
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 17.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».*****
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Меладрама «Ветраная жанчына».*****
**21.00** Панарама.
**21.45** Жанчыны і спорт. Марына Арзамасава.
**22.15 Меладрама «Клопаты-радасці Надзеі».*****
**1.50** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 23.45** Тэлебарометр.
**9.05, 18.50 Серыял «Апошні з Магікян».*****
**10.20, 17.25 Дэтэктыў «Такая работа».*****



**11.15, 16.35 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».***
**12.15, 19.55** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам.
**18.15** «Пра ежу».
**21.40, 22.05** «Бітва экстрасэнсаў». 14-ы сезон.
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.50 Баявік «Прафесіянал».*****

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранавак».
**7.35** «Беларуская кухня». Запяканка з бульбы.
**8.00, 12.00, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Ясенін». Драма.*****



**9.10, 14.00 «Вой, ма-мач-кі!» Меладрама.***
**11.00** «Гітара па крузе».
**12.15** «Навукаманія».
**12.40** «Эпоха». Ігнацій Дамейка.
**13.35** «Сіла веры».
**15.45** М/ф.0
**16.00, 21.05** «Бамбардзіроўшчыкі і штурмавікі Другой сусветнай». Дак. фільм.*
**16.40, 21.40 «Вяртанне Будулая». Драма.***
**17.45, 22.50 «Сеткавая пагроза». Дэтэктыў.*****
**19.30** «Музеі Беларусі». Бабруйскі краязнаўчы музей.
**19.55** «Тэатр у дэталях». Спектакль Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Раскіданае гняздо».
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**7.50** Авертайм.
**8.15, 10.10** Футбол. Ліга Еўропы. 1/8 фіналу. Матч у адказ.
**12.05** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. 1/2 фіналу. Пяты матч.
**14.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Жараб'ёўка.
**14.40** Козел пра футбол.
**15.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Жараб'ёўка.
**15.50, 22.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Халменколен. Спрынт. Жанчыны.
**17.20** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ. Агляд.
**18.20** Біятлон. Этап Кубка свету. Халменколен. Спрынт. Мужчыны.
**19.45** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Другі паўфінал. Чацвёрты матч. ХК «Гомель» — «Нёман» (Гродна). (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
**22.00** Піт-стоп.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.20** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Час пакажа».
**16.20 Меладрама «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».**
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».*****
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Голас. Дзеці». Новы сезон.
**22.50 Маст. фільм «Другі мужчына».***
**0.25** «Вячэрні Ургант».
**1.05** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40, 0.00 «Знахар. Паляванне без правілаў». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Дзіўная справа».
**15.35 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Адкрытая размова».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Канец Свету наступіць заўтра?»
**22.00** «Глядзець усім!»
**1.35** «Соль». Музычнае шоу.

### МІР

**6.00** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00 Серыял «Спадчына».*****
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы».***
**17.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20 Маст. фільм «Дакрануцца да неба».*****
**21.05 Маст. фільм «Суперцешча для няўдачніка».*****
**23.00 Маст. фільм «Як Іванка-дурань па цуд хадзіў».***
**0.30** «Трымайся, шоубіз!»*
**1.00** «Я — валанцёр».*
**1.30 Маст. фільм «Роднае дзіця».*****
**4.10** М/ф.0

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Маст. фільм «Нінчына каханне».***
**19.20, 20.40 Серыял «Крагутая».**
**22.00, 23.10** «Гумарына».
